# КАЗНАЧЭЙСКАЯ СІСТЭМА ВЫКАНАННЯ БЮДЖЭТУ ФОНДУ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ НАСЕЛЬНІЦТВА МІНІСТЭРСТВА ПРАЦЫ І САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Г. А. Маеўскі**
Беларускі дзяржаўны універсітэт

Адной з праблем бюджэтнага ці мэтавага пазабюджэтнага фонду з'яўляецца размеркаванне на прадугледжаныя мэты. З дадзенай праблемай сутыкаюцца ўсе краіны свету, і Беларусь гэта не абмінула. Неабходны цэнтралізаваны кантроль за сродкамі фондаў дзеля гарантавання мэтавасці выдаткоўвання грашовых сродкаў. З гэтай нагоды з 1 красавіка 2004 г. Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН) быў пераведзены на казначэйскую сістэму выканання бюджэту.

Казначэйская сістэма грунтуецца на стварэнні адзінага казначэйскага рахунку, што акумулюе грашовыя сродкі бюджэту ФСАН і адлюстроўвае аперацыі органаў Фонду па выкананні выдатковага боку бюджэту. Дадзены рахунак адкрываецца Галоўным дзяржаўным казначэйствам Рэспублікі Беларусь. Для кожнага аддзялення Фонду па вобласці і гораду Мінску адкрываецца шэраг транзітных рахункаў па раённаму прынцыпу. Юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі пералічваюць абавязковыя страхавыя ўзносы менавіта на гэтыя транзітныя рахункі, з якіх грошы і паступаюць на адзіны рахунак.

Дзеля забеспячэння эфектыўнага выдаткавання сродкаў Фонду ствараюцца транзітныя рахункі па размеркаванню. Яны павінны ўтварацца ў кожнай вобласці і ў горадзе Мінску. Штодзень з адзінага рахунку пералічваюцца грошы на канрэктныя мэты, якія замацаваны ў бюджэце ФСАН. Па кожнаму пункту выдаткаў сума пералічэння вызначаецца індывідуальна ў адпаведнасці з наяўнасцю грашовых сродкаў. Пасля паступлення грошай на тэрытарыяльныя рахункі яны адпраўляюцца на рахункі юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

Па заканчэнні аперацыйнага дня невыкарыстаныя грашовыя сродкі вяртаюцца на адзіны рахунак. Усе аперацыі аўтаматычна адлюстроўваюцца ў галоўнай кнізе плацяжоў. Значным плюсам вяртання грошай на адзіны рахунак з'яўляецца татальны кантроль за выдаткаваннем сродкаў бюджэту Фонду. Нават пры элементарным матэматычным падліку вернутай і выкарыстанай сум і параўнанні іх з першапачатковай можна знайсці нямэтавае выкарыстанне сродкаў.

Казначэйская сістэма дае магчымасць штодзённага кантролю за паступленнем абавязковых страхавых узносаў, якія таксама аўтаматычна рэгіструюцца пры пералічэнні на транзітны рахунак і

абавязкова адпраўляюцца ў канцы аперацыйнага дня на адзіны рахунак.

На жаль, існаванне казначэйскай сістэмы не можа вырашыць праблему чалавечага фактару. На бягучы момант не з’яўляецца складаным пры дапамозе супрацоўнікаў раённых аддзелаў Фонду фіктыўна афарміць надыход страхавога выпадку для пэўнай асобы і атрымліваць грошы з ФСАН.